УДК 882.6

**Я. Д. Манько, К. Д. Чабак, М. С. Малатоўнік, М. П. Лісіна**
*Дзяржаўная установа адукацыі «Ліцэй № 1 г. Баранавічы», Баранавічы, Рэспубліка Беларусь*

# ДУХОЎНЫЯ І МАТЭРЫЯЛЬНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ Ў ПАЭМЕ ЯНКІ КУПАЛЫ «ЯНА І Я»

**Уводзіны.** Імя Янкі Купалы залатымі літарамі ўпісана ў гісторыю айчыннага прыгожага пісьменства. Творчасць паэта цалкам вырасла на народным грунце. У выніку Купала стаў народным песняром, класікам новай беларускай літаратуры. Ён бачыць у простым беларусе вялікі творчы і інтэлектуальны патэнцыял, парасткі нацыянальнай свядомасці, імкненне і здольнасць змяніць да лепшага абставіны і ўмовы свайго існавання. Янку Купалу і Якубу Коласу належыць першаснае поўнае мастацкае адкрыццё народа — яго гісторыі, мовы, звычаяў, народнага побыту і нацыянальнага характару, матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей.

Паэма «Яна і я» займае адметнае месца ў творчасці Янкі Купалы. Гэта апошні з буйных твораў паэта, напісаных ім перад Першай сусветнай вайной. У ёй класік па-майстэрску ўвасобіў сваё захапленне жыццём і глыбокай духоўнасцю чалавека працы.

Актуальнасць тэмы каштоўнасцей чалавечага жыцця абумоўлена ўсведамленнем важнасці традыцыйных каштоўнасцей ва ўмовах зменлівага свету.

**Асноўная частка.** У псіхалогіі існуе паняцце піраміды А. Маслоу, які зрабіў класіфікацыю асноўных, так званых базавых патрэб і каштоўнасцей чалавека. Галоўная з іх — жыццё. На працягу жыцця чалавек адчувае і імкнецца задаволіць розныя фізіялагічныя патрэбы, патрэбу ў бяспецы, у павазе і прызнанні, у асабовай самарэалізацыі. У пазнейшых працах Абрахам Маслоу дадаў узроўні пазнавальных здольнасцей і эстэтычных патрэб, якія ўзнікаюць пры задавальненні базавых.

У вершах Янкі Купалы можна вылучыць своеасаблівы пералік патрэб і каштоўнасцей беларускага селяніна, ад імя якога гаворыць паэт. Можна сказаць, што гэта рух чалавека ад падножжа да вяршыні піраміды, ад матэрыяльнага да духоўнага. Спачатку купалаўскія героі выказваюць патрэбу мець «перш-наперш хлеба...» [1, с. 217], потым усведамляюць неабходнасць «школы па вёсках прыдбаць» [1, с. 217], набыць «крыху долі, волі...» [1, с. 142], і ўрэшце задаволіць духоўную патрэбу «людзьмі звацца» [1, с. 196]. У жыцці селяніна-беларуса можна вылучыць такія ключавыя каштоўнасці, як працавітасць, талерантнасць, гасціннасць, эмацыянальная стрыманасць, патрыятызм, адчуванне прыгажосці і ўменне яе ствараць.

Паэма «Яна і я» традыцыйна ацэньваецца як ідылічна-пастаральны твор, які адлюстроўвае высокія пачуцці і адносіны паміж закаханымі. Твор эмацыйна насычаны, для яго характэрныя народна-песенныя матывы, вобразы, паэтыка. Гэтая паэма — твор найбольшай філасофскай засяроджанасці, найбольш абагульнена-сінтэтычная ў купалаўскім паэтычным роздуме аб зямлі і жыцці**.** У паэме «Яна і я» Янка Купала шырока раскрыў свае адносіны да жыцця, захапленне яго асноватворнымі праявамі: працай, каханнем, глыбокай духоўнасцю чалавека працы як творцы ўсіх матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей.

У эпіцэнтр сялянскага жыцця Янка Купала ставіць працавітую сям’ю. Паэт ідэалізуе тып сям’і, які ўзнік на аснове народных уяўленняў аб прыгожым і быў замацаваны ў фальклоры. Усе асноўныя каштоўнасці чалавечага жыцця арганічна спалучаюцца ў сям’і, асабліва калі яна заснавана на каханні і павазе. Каханне купалаўскіх персанажаў дасканалае, яно натхняе іх на стварэнне якасна новага сэнсу быцця. У адносінах ёсць усё, што забяспечвае трываласць пачуцця. Ён і Яна ўзаемна ўзбагачаюцца і развіваюцца, клапоцяцца, духоўна падтрымліваюць, паважаюць і імкнуцца зразумець адзін аднаго. Вобраз каханай у творы сімвалізуе Маладую Беларусь.

Паэма «Яна і я» па-мастацку вобразна выяўляе агульначалавечую каштоўнасць сялянскай працы на зямлі. У ладзе жыцця простага беларуса аўтар бачыць ідэал чалавечага існавання. Адносіны да працы — аснова жыццёвых уяўленняў прынцыпаў герояў-сялян: *«Няўжо ж не робячы жыць?»; «Жывому ж чалавеку трэба нешта рабіць»; «Чалавек без работы не можа доўга быць…».* Паэма раскрывае маральна-паэтычны свет зямнога існавання чалавека, радасць гаспадара ад сумеснай працы са сваёй каханай: *«І выйшаў сеяць я. Яна стаяла / Непадалёк мяне, на ўзмежку; / У высях сонца золатам зіяла, / Ўнізу плыў вечар сваёй сцежкай. / Пасыпаліся дробныя зярняты / Ў раллю як пацеркі янтарны, / На наш загон, сахою узараны, / На мой шнурок — палетак ярны. / Яна, як ніцая бярозка тая, / Стаяла, за сяўбой слядзіла, / І як бы Багародзіцца святая — / Здавалася мне — блаславіла»* [2, с. 103].

Адносіны беларусаў да працы абумоўлены сакральным стаўленнем беларусаў да зямлі, якая асэнсоўваецца як умова гарманічнага існавання: робіць свабодным і патрабуе адказнасці, выступае элементам матэрыяльнай спадчыны і пераемнасці. У ладзе жыцця беларуса Янка Купала бачыць ідэал чалавечага існавання. Праз паказ самых будзённых заняткаў паэт імкнецца ўбачыць і вылучыць самае светлае, найбольш урачыстае і святочна-ўзвышанае. Праца на ўласнай зямлі, клопат пра сямейны дабрабыт, асветленыя пачуццём кахання ўзаемаадносіны героя і гераіні, захапленне самім працэсам жыцця спрыяюць асабоваму руху чалавека «наперад і вышэй», даюць яму ўяўленне пра гармонію свету і адзінства сусвету.

Павага да традыцый, якіх *«здавен-даўна на нашай зямлі»* трымаліся *«дзяды і прадзеды»*, да звычаяў продкаў, да бацькоўскай навукі *(«Ўжо час узяцца за сявалку, // Ў зямлю зярнят насыпаць жменяй поўнай, // Як ад бацькоў навучыўся змалку»)* дазваляе героям Купалы адчуць сваю невыпадковасць у гэтым свеце.

© Манько Я. Д., Чабак К. Д., Малатоўнік М. С., Лісіна М. П., 2022

Рэпазіторый БарДУ

Назіранне за з’явамі прыроды, атрыманне асалоды ад, здавалася б, штодзённай працы развівае ў герояў паэмы ўменне сузіраць. Яна і Ён не жывуць бяздумна і бестурботна. Яны зачараваны наваколлем, па-дзіцячы адкрыты перад жыццём, увесь час шукаюць адказы на «вечныя» пытанні. Менавіта жанчыне ў паэме надаецца галоўная роля ў адказе на гэтыя «вечныя» пытанні, захаванне традыцый, правядзенне розных абрадавых дзеянняў. Гэта прасочваецца ў раздзеле «Выган у поле жывёлы»: *«Кароўку маем мы — завецца Аўтарыняй, // Багацце кожнага гаспадара, // Скарб і пацеха кожнай гаспадыні. // «Мая» не выгнала яе за край // Платоў, на пашу, дзе яна хадзіла, // Пакуль таго, што вучыць абычай, // Над ёй сваёй рукою не ўчыніла. // Свянцоным хлебам, соллю і вадой // Абнесла навакол яе тры разы, // Паставіла да сонца галавой // І загавор чыніла ад заразы»* [2, с. 98].

У адпаведнасці са старажытнымі светапоглядным ўяўленнямі продкі лічыліся сапраўднымі ўладарамі зямлі. Ад іх залежала яе ўрадлівасць, багаты ўраджай. Таму ў беларусаў існавала жорсткая забарона пачынаць працу на зямлі да Радаўніцы [3, с. 56]: *«На радаўніцу мы на магілкі пайшлі, // Свянцонага з сабой астаткі ўзяўшы, // Як гэта з давен-даўна на нашай зямлі // Дзяды і прадзеды рабілі нашы. // Маліліся нябожчыкаў адведаць мы»* [2, с. 100].

Павага да традыцый дае магчымасць героям Купалы адчуць сваю повязь з продкамі, узмацняе іх разуменне адказнасці адзін перад адным, спрыяе духоўнай з’яднанасці.

**Заключэнне.** Ключавыя каштоўнасці беларускага сялянства — гэта працавітасць, здароўе, прыродны розум, талерантнасць, патрыятызм, стрыманасць у праяўленнях пачуццяў, ашчадныя адносіны да рэчаў, імкненне ўпрыгожыць жыццё і побыт. Сістэма каштоўнасцей трансфармуецца ў паэтычныя вобразы. У сістэме адносін герояў да асяроддзя і рэчаіснасці спалучаецца традыцыйнае і канкрэтна-гістарычнае.

У паэме «Яна і я» Янка Купала ўпершыню шырока раскрыў свае адносіны да жыцця, сваё захапленне яго асноўнымі праявамі: працай, каханнем, сямейнымі каштоўнасцямі, глыбокай духоўнасцю чалавека як творцы ўсіх матэрыяльных і духоўных багаццяў.

Такія асабовыя вартасці, як шчырасць, сяброўства, гонар, працавітасць, сумленнасць, грунтуюцца на вышэйшых маральных прынцыпах. Гэтыя якасці павінны выхоўвацца ў кожнага чалавека з маленства. Асноўная роля ў працэсе выхавання належыць сям’і. У паэме «Яна і я» паэт увасобіў ідэал сям’і, якую ён ставіць у эпіцэнтр сялянскага жыцця.

Адносіны да працы з’яўляюцца асновай жыццёвых прынцыпаў герояў-сялян. Яны абумоўлены сакральным стаўленнем беларусаў да зямлі, якая асэнсоўваецца як умова гарманічнага існавання.

Змест паэмы «Яна і я» сведчыць, што традыцыі беларускага народа, праверанея стагоддзямі, сыходзяць далёка ў мінулае, надаючы трываласці і ўпэўненасці сучаснаму свету. Галоўная роля ў захаванні традыцый надаецца жанчыне.

**Спіс цытуемых крыніц**

1. *Купала, Я.* Поўны збор твораў : у 9 т. / Я. Купала / прадм. У. Гніламёдава. — Мінск : Маст. літ, 1995. — Т. 1 : Вершы, пераклады, 1904—1907. — 462 с.

2. *Купала, Я.* Паэмы. Драматычныя творы / уклад. А. А. Сляпцовай ; паслясл. В. А. Каваленкі ; мал. В. П. Шаранговіча. — Мінск : Маст. літ., 1989. — 494 с.

3. *Ярашэвіч, Т.* Мадэлі ідэальнага існавання ў паэме «Яна і я» Янкі Купалы / Т. Ярашэвіч // Роднае слова. — 2012. — № 6. — С. 56—58.

Репозиторий БарГУ